# КРЫНІЦАЗНАЎЧАЯ КАШТОЎНАСЦЬ І ІНФАРМАТЫЎНАСЦЬ КНІГ ГАРАДСКОГА САМАКІРАВАННЯ (НА ПРЫКЛАДЗЕ МАГІСТРАЦКІХ КНІГ МЕНСКА ЗА ДРУГУЮ ПАЛОВУ XVII СТАГОДДЗЯ)

***Н. М. Палтаржыцкая***

*Інстытут гісторыі НАН РБ, вул. Акадэмічная, 3, 220012, г. Мінск, Беларусь*
*nadzieja_st@tut. by*

Дакументы магістрацкіх кніг за другую палову XVII ст. з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вызначэння складу ўраднікаў, іх прафесійнай прыналежнасці, веравызнання і сваяцкіх адносінаў. Асобныя разнавіднасці дакументаў таксама ўказваюць на пэўныя службовыя абавязкі і паўнамоцтвы кожнай групы ўраднікаў, накірункі дзейнасці органа гарадскога самакіравання.

***Ключавыя словы:*** магдэбургскае права; актавыя кнігі магістратаў, гарадское самакіраванне; менскі магістрат.

# THE SOURCE VALUE AND INFORMATION CONTENT OF THE BOOKS OF THE CITY SELF-GOVERNMENT (ON THE EXAMPLE OF THE MAGISTRATES' BOOKS OF THE MINSK OF THE SECOND HALF OF THE 17TH CENTURY)

***N. M. Paltarzhytskaya***

*Institutes of histories of the National Academy of Sciences of the Republic of Belarus*
*Akademichnaya st., 3, 220012, Minsk, nadzieja_st@tut. by*

The documents of the magistrates' books of the second half of the 17th century are a valuable sources for determining the composition of officials, their professional affiliation, religion and family relations. Certain types of documents also indicate certain responsibilities and powers of each group of officials, the activities of the city administration.

***Key words:*** Magdeburg law; act books of the magistrate, city self-government; Minsk magistrates' books**.**

Крыніцаўчая каштоўнасць і інфарматыўнасць актавых кніг, якія былі створаны ў выніку дзейнасці рэгіянальных улад Вялікага Княства Літоўскага зусім не вывучана. Між тым, спецыфіка дакументаў, якія змяшчаюцца ў гэтых кнігах, можа перавышаць па сваёй інфарматыўнасці добра вядомыя ў гістарычнай літаратуры кнігі Метрыкі Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ) і дакладна іх пераўзыходзіць у плане асвятлення рэгіянальнай гісторыі: гісторыі паветаў і гарадоў з магдэбургскім правам у розных яе аспектах (гістарычнай геаграфіі, генеалогіі, дзейнасці судовых і адміністрацыйных органаў і г. д.). Усё сказанае цалкам адносіцца да такой разнавіднасці актавых кніг, як магістрацкія кнігі, а таксама серыі кніг магістрата Менска (сучасны г. Мінск).

Сфера дзейнасці магістратаў была разнабаковай: тут павінны былі рэгістравацца акты натарыяльнага характару, гаспадарча-фінансавыя адносіны жыхароў горада, адміністрацыйныя стасункі і інш. Усё гэта стварала ўмовы для адлюстравання ў магістрацкіх кнігах розных бакоў жыцця тагачаснага грамадства. У залежнасці ад статусу і эканамічнага развіцця горада колькасць кніг, якія былі створаны ў канцылярыі гарадскога самакіравання, таксама была рознай. Акрамя названых вышэй відаў абавязковых для вядзення судовых кніг (кнігі запісаў («спраў вячыстых»), дэкрэтавыя і паточныя), важнымі для забеспячэння адміністрацыйнага кіравання горадам з’яўляліся кнігі пратаколаў пасяджэнняў магістрата. Не заўсёды ўключаліся ў кнігі пэўныя дакументы фінансавага характару, чарнавыя запісы з падлікам рахункаў, а таксама розныя дакументы і запісы, якія складаліся пад час працы службовых асоб гарадскога самакіравання і інш. Частка такой дакументацыі па розных прычынах (чарнавы характар запісаў, малаважны характар запісаў, адсутнасць сродкаў з гарадскога бюджэту і інш.) не падшывалася, таму з большага не захавалася да цяперашняга часу альбо захаваліся ў нешматлікіх россыпах дакументаў. У той жа час вялікая ўвага на дзяржаўным узроўні адводзілася ўмовам захавання судовых кніг [1, с. 92]. Гэта тлумачыцца тым, што да іх запісаў звярталіся на працягу стагоддзяў па розных (часцей маёмасных) пытаннях.

Паўната і інфарматыўнасць магістрацкіх кніг як крыніц па гісторыі гарадскога самакіравання Менска абумоўлена тыпам і складам кніг, а таксама іх адносінамі да органаў гэтага самакіравання. Дадзеныя кнігі складаліся з запісаў і дакументаў, якія фіксавалі ажыццяўленне прававых працэдур, што знаходзіліся ў веданні і кампетэнцыі магістрата. Структура ўказанных дакументаў патрабавала выразнага абазначэння віда прававога дзеяння, рэгламента яго ажыццяўлення, дакладнай фіксацыі яго рэалій, указаннем складу службовых асоб, якія былі адказныя за выкананне і кантраляванне гэтых дзеянняў. Вядзенне названых кніг было складовай часткай і атрыбутам інстытута самакіравання, магдэбурскага права, прававой сістэмы ВКЛ, уваходзіла ў абавязкі службовых асоб. Усё гэта робіць магістрацкія кнігі Менска першачарговай крыніцай у вывучэнні органаў самакіравання Менска з пункту гледжання інфармацыйнасці і дакладнасці іх дадзеных параўнальна з іншымі відамі крыніц. Кніга «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг. (на сённяшні дзень падзелена на дзве часткі за 1663–1677 гг. і 1667–1680 гг.) і кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. – самыя раннія з комплексу магістрацкіх кніг Менска і адзінкавыя за другую

палову XVII ст. [2–4] Іх дакументы і запісы змяшчаюць асноватворныя і ключавыя факты, неабходныя для абгрунтаванай рэканструкцыі структуры і дзейнасці менскага магістрата (арганізацыя, абавязкі ўраднікаў і іх паўнамоцтвы, парадак дзейнасці), вывучэння персанальнага складу службовых асоб (прафесійная прыналежнасць, веравызнанне, сваяцкія сувязі і інш.).

Даследаванне актавых кніг магістратаў беларускіх гарадоў як асобнага комплексу дакументальных крыніц, а таксама інфармацыйнага патэнцыялу іх дакументаў у айчыннай гістарыяграфіі пачалося толькі ў апошнія два дзесяцігоддзі [5–8]. У пэўнай меры магістрацкія кнігі і раней выкарыстоўваліся гісторыкамі пры вывучэнні сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў у асяродку мяшчан. Аднак не існавала іх крыніцазнаўчага апісання, а самі кнігі не выступалі як прадмет для асобнага даследавання. Між тым, яшчэ ў канцы 20–х гг. ХХ ст. В. Д. Дружчыц назваў магістрацкія кнігі «асноўным матэрыялам для вырашэння пытання арганізацыі дзейнасці гарадскіх улад» [9, с. 26]. Яго працы па даследаванні гісторыі самакіравання беларускіх гарадоў і на сённяшні дзень застаюцца запатрабаванымі, нягледзячы на тое, што па прычыне недахопу даных не маглі быць праведзены ў поўнай меры. Даследчык выкарыстоўваў пераважна апублікаваныя крыніцы, спасылаючыся на невялікую захаванасць магістрацкіх кніг. Акрамя гэтага, на абмежаванасць доступу да выкарыстання і даследавання магістрацкіх кніг на той час для беларускіх навукоўцаў уплывала і месцазнаходжанне некаторых крыніц. Для прыкладу, комплекс кніг магістрата Менска захоўваўся ў першай палове ХХ ст. у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР у г. Вільнюсе. У архівы БССР менскія магістрацкія кнігі былі перададзены пасля 1948 г. [10, с. 3]

На ўзровень інфарматыўнасці менскіх магістрацкіх кніг уплывае ў першую чаргу характар унесеных у іх дакументаў і запісаў. Спецыфіка кнігі «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг. і кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг. з пункту гледжання іх дакументальнага складу абумоўлена рознымі функцыямі гэтых кніг. Першая кніга з'яўлялася сродкам афіцыйнага пасвядчэння дамоў. Дамова набывала прававую сілу у выпадку ўключэння запісу аб ёй у кнігі і выдачы адпаведнага выпісу. Так, большую частку актыкацый кнігі «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг. складаюць дакументы па справах з нерухомай маёмасцю: лісты на яе прадаж, падараванне, заставу, арэнду, пераўступку і інш. Наступнымі па колькасці з'яўляюцца запісы здзелак па фінансавых справах менскіх мяшчан. Сярод іх

квітацыйныя лісты аб выплаце пазыкі, аб прызнанні доўгу ці скаргі аб яго невяртанні, аб перадачы каштоўных папер новаму ўладальніку і інш. Аднак, нягледзячы на пераважную большасць актыкацый сацыяльна-эканамічнага характару, дакументы кнігі «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг. змяшчаюць важную інфармацыю па персанальнаму складу ўраднікаў і некаторых іншых службовых асоб Менскага магістрата, а таксама іх службовых абавязках ў адзначаны перыяд [11, с. 168]. Так, у інтытуляцыі дакументаў уносіліся імёны прысутных на пасяджэнні ўраднікаў (бурмістраў, райцаў і часам лаўнікаў) ці асобаў, што іх замянялі, а таксама войта (альбо яго намесніка) і ў некалькіх выпадках «мужоў гмінных», цэхмістраў, прадстаўнікоў ад паспольства. Трэба ўлічваць і шырэйшы храналагічны перыяд кнігі, што прадстаўляе магчымасць узнавіць персанальны склад ураднікаў Менскага магістрата за 1663–1680 гг. [12, с. 78]. Акрамя гэтага, кніга «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг. змяшчае пэўныя звесткі аб былых менскіх ураднiках у паўторных актыкацыях выпісаў за першую палову XVII ст., у апісаннях месцазнаходжання зямельных уладанняў у дакументах па справах з нерухомай маёмасцю (указваліся былыя ўладальнікі нерухомасці ці суседзі), тэстаментах і некаторых іншых разнавіднасцях актыкацый.

Акрамя гэтага, на падставе аналізу даных дакументаў кнігі «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг. магчыма прасачыць не толькі «кар’ерны» рост, сацыяльны статус ураднікаў, але і высветліць іх прафесійную прыналежнасць, родныя сувязі і веравызнанне. Усе разнавіднасці актыкацый, унесеных у кнігу, вызначаюць пэўныя службовыя абавязкі членаў магістрата, якія яны выконвалі на кожным этапе пры складанні і зацвярджэнні дакумента. Невялікая колькасць запісаў указвае на персаналіі і абавязкі такіх службовых асоб Менскага магістрата як пісар, гмінныя, цэхмістры, паспольства, «слугі мейскія», інстыгатары і інш.

Дакументаў па судовай, адміністрацыйна-распарадчай і фінансавай дзейнасці магістрата ў кнізе няшмат. Аднак прадстаўленыя нават у невялікай колькасці такія запісы з’уляюцца каштоўнымі для вывучэння структуры і дзейнасці гарадскога самакіравання Менска. У іх сустракаюцца таксама звесткі аб узаемаадносінах гарадской юрыдыкі з іншымі адміністрацыйнымі цэнтрамі і прадстаўніцтвам каралеўскай улады ў горадзе (войтам і лантвойтам), называецца колькасць іншых юрыдык Менска, магчыма вызначыць прыблізныя межы «ратушнай» юрыдыкі і інш. [13, с. 69]

Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. не з'яўляецца актавай кнігай. Яна складаецца з кароткіх і схематычных, падобных больш на чарнавыя пратакольныя запісы штотыднёвых спраў судовых і сесійных пасяджэнняў магістрата. Пратаколы адлюстроўваюць ход грамадскага сходу, судовага слухання і прынятыя рашэнні.

Нягледзячы на невялікі храналагічны перыяд запісаў кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг., яны змяшчаюць разнастайную інфармацыю па гісторыі горада. Паводле сваёй тэматыкі іх можна падзяліць на запісы аб крымінальных злачынствах (крадзяжы, забойстве, збіцці, грабяжы) і аглядзе месца злачынства; запісы па фінансавым справам (выплата пазыкі, падцвярджэнні доўгу, збор і размеркаванне агульнагарадскіх падаткаў і інш.); запісы здзелак з нерухомай маёмасцю (купля-продаж, падараванне, здача ў арэнду, пераўступка зямельных уладанняў ці гаспадарчых пабудоў) і запісы па іншай адміністрацыйна-распарадчай дзейнасці ўраднікаў (забудова горада, усталяванне і перанос крамаў у гарадскім рынку, нагляд за прыладамі вагі і меры, ацэнка вартасці пэўных рэчаў і маёмасці, устанаўленне апякунства, запіс тэстаментаў, заслухоўванне прысягі мяшчан, а таксама новаабраных членаў магістрата і іншых службовых асоб, вырашэнне цэхавых спрэчак, рэгуляванне ўнутраных пытанняў функцыянавання магістрата і інш.).

Кніга пратаколаў 1674–1680 гг. храналагічна ахоплівае меншы перыяд часу ў параўнанні з кнігай «спраў вячыстых» 1663–1680 гг., аднак яна з'яўляецца галоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі гарадскога самакіравання Менска ў другой палове XVII ст. Яе запісы змяшчаюць больш інфармацыі па пытаннях дзейнасці і функцыянавання Менскага магістрата ў адзначаны перыяд. Дакладна агаворваюцца дні і пэўны час пачатку сходаў, называюцца дні па-за планавых склікання ў, прычыны і час пераносу пасяджэнняў і інш. Акрамя гэтага, у кнігу ўпісаныя пратаколы «енеральных» і «вальных» сесій, на якіх на пачатку года вырашаліся самыя важныя пытанні (перадача паўнамоцтваў новай «рочнай» змене ўраднікаў, арэнда гарадской нерухомай маёмасці, складанне клятвы і ганаровае ўступленне на пасаду новых членаў магістрата і інш.), а таксама праводзіліся выбары і выслухоўвалася прысяга ўраднікаў. Каштоўную інфармацыю змяшчаюць пратаколы аўторкавых сесій магістрата па бягучых справах гарадскога кіравання (продаж гарадской маёмасці, збор і выплата падаткаў у гарадскі і дзяржаўны скарб, рэгуляванне пытанняў па справах гандлю, злоўжыванне службовымі абавязкамі ўраднікамі, заслухоўванне прысягі ўраднікаў і менскіх мяшчан і інш.).

Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. змяшчае больш падрабязныя звесткі аб канфесійнай прыналежнасці ўраднікаў, замене «рочных», выбары на пасады і выкананне прысягі абранымі асобамі, службовых абавязках і паўнамоцтвах розных катэгорый ураднікаў і іншага персаналу магістрата («мужах гмінных», цэхмістрах, паспольстве, «слугах мейскіх», бірчых, шафарах і інстыгатарах) [14, с. 22]. Даныя аб персанальным складзе ўраднікаў магістрата ў запісах кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг. істотна дапаўняюць інфармацыю, якая прысутнічае ў кнізе «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг.

Такім чынам, дакументы магістрацкіх кніг за другую палову XVII ст. змяшчаюць асноватворныя і ключавыя факты, неабходныя для абгрунтаванай рэканструкцыі структуры і дзейнасці Менскага магістрата ў адзначаны перыяд.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Палтаржыцкая Н. М. Звесткі аб стане захавання архіва і колькасным складзе кніг Менскага магістрата ў XIX ст. // ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы. 2020. С. 92–93.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 1.
3. НГАБ. Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 33.
4. НГАБ. Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 54.
5. Гардзееў М. Ю. Актавыя кнігі беларускіх магістратаў XVI–XVII стст. // Наука и инновации. 2003. № 3/4. С. 108–110.
6. Гардзееў М. Ю. Полацкія магістрацкія кнігі 2-й паловы XVII ст. як гістарычная крыніца // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. 1998. С. 76–79.
7. Стрэнкоўскі С. П. Актавая кніга Ружанскага магістрата як крыніца па гісторыі гарадскога самакіравання // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. 2012. Вып. 14. С. 72–83.
8. Грыб А. В. Дзісненскі магістрат: структура і функцыі (паводле актавых кніг перыяду Рэчы Паспалітай) // Архіварыус. 2012. Вып. 10. С. 155–168.
9. Дружчыц В. Магістрат у беларускіх местах з магдэбургскім правам у XV–XVII ст. Мінск, 1929. 31 с.
10. НГАБ. Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 56.
11. Палтаржыцкая, Н. М. Склад органаў гарадскога самакіравання Менска ў 1663-1680 гг. (паводле дакументаў актавых кніг) // Архіварыус. 2018. – Вып. 15. С. 167–177.
12. Статкевіч Н. М. Актавыя кнігі «спраў вячыстых» менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі інстытута самакіравання горада // Раманаўскія чытанні – 7. Магілёў, 2011. С. 78–79.
13. Палтаржыцкая Н. М. Зямельныя ўладанні князёў Радзівілаў у Мінску (паводле дакументаў XVI–XVIII стст) // Весці Акадэміі навук Беларусі. 2012. № 3. С. 69–75.
14. Палтаржыцкая Н. М. Крыніцы па гісторыі вывучэння дапаможнага персаналу Менскага магістрата другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2018. №4. С. 22–31.